# ЭВАЛЮЦЫЯ ЎСХОДНЯЙ ПЕРЫФЕРЫІ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ І ЗМЯНЕННЕ ГЕАПАЛІТЫЧНАГА СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ

**М. М. Мязга**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны,*
*вул. Савецкая, 104, 246019, г. Гомель, Беларусь, miazgamm65@gmail.com*

У артыкуле ахарактарызаваны змены геапалітычнага становішча Беларусі ў кантэксце эвалюцыі Версальскай сістэмы міжнародных адносін. Устаноўлена, што яго важнейшай характарыстыкай з'яўляўся падзел тэрыторыі Беларусі паміж СССР і Польшчай. Вырашэнне пытання ўз'яднання Беларусі знаходзілася ў непарыўнай сувязі са змяняненнем міжнароднага парадку, устаноўленага ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе Версальскім і Рыжскім дагаворамі. Тэрыторыя Беларусі стала ўчасткам супрацьстаяння дзяржаў, адны з якіх імкнуліся захаваць Версальскую сістэму, а іншыя — дамагчыся яе рэвізіі. Крызіс Версальскай сістэмы стаў адной з важнейшых перадумоў узнікнення Другой сусветнай вайны, а крах яе ў канцы 1930-х гг. стварыў спрыяльныя міжнародныя ўмовы для далучэння Заходняй Беларусі да БССР.

***Ключавыя словы:*** Версальская сістэма; Беларусь; Рыжскі дагавор; калектыўная бяспека; уз'яднанне Заходняй Беларусі.

# ЭВОЛЮЦИЯ ВОСТОЧНОЙ ПЕРИФЕРИИ ВЕРСАЛЬСКОЙ СИСТЕМЫ И ИЗМЕНЕНИЕ ГЕОПОЛИТИЧЕСКОГО ПОЛОЖЕНИЯ БЕЛАРУСИ

**Н. Н. Мезга**

*Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины,*
*ул. Советская, 104, 246019, г. Гомель, Беларусь, miazgamm65@gmail.com*

В статье охарактеризованы изменения геополитического положения Беларуси в контексте эволюции Версальской системы международных отношений. Установлено, что его важнейшей характеристикой являлся раздел территории Беларуси между СССР и Польшей. Решение вопроса воссоединения Беларуси находилось в неразрывной связи с изменяем международного порядка, установленного в Центрально-Восточной Европе Версальским и Рижским договорами. Территория Беларуси стала участков противостояния государств, одни из которых стремились сохранить Версальскую систему, а другие — добиться ее ревизии. Кризис Версальской системы стал одной из важнейших предпосылок возникновения Второй мировой войны, а крах её в конце 1930-х гг. создал благоприятные международные условия для воссоединения Западной Беларуси с БССР.

***Ключевые слова:*** Версальская система; Беларусь; Рижский договор; коллективная безопасность; воссоединение Западной Беларуси.

# THE EVOLUTION OF THE EASTERN PERIPHERY OF THE VERSAILLES SYSTEM AND THE CHANGING GEOPOLITICAL POSITION OF BELARUS

**M. M. Miazga**

*Francisk Skorina Gomel State University,*
*104 Savieckaja Street, Homieĺ, 246019, Belarus, miazgamm65@gmail.com*

The article describes the changes in the geopolitical position of Belarus in the context of the evolution of the Versailles system of international relations. It is established that its most important characteristic was the division of the territory of Belarus between the USSR and Poland. The solution to the issue of the reunification of Belarus was inextricably linked with the changing of the international order established in Central and Eastern Europe by the Treaties of Versailles and Riga. The territory of Belarus became one of the sites of confrontation between states, some of which sought to preserve the Versailles system, while others sought to achieve its revision. The crisis of the Versailles system became one of the most important prerequisites for the outbreak of the Second World War, and its collapse in the late 1930s created favorable international conditions for the reunification of Western Belarus to the BSSR.

***Keywords:*** Versailles system; Belarus; Riga Treaty; collective security; reunification of Western Belarus.

Асаблівасцю міжнароднага парадку, які сфармаваўся ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе (ЦУЕ) пасля Першай сусветнай вайны, было тое, што яго важнейшыя рысы былі вызначаны не толькі Версальскім, але і Рыжскім дагаворам. Апошні ўносіў карэктывы ў тую сістэму міжнародных адносін у ЦУЕ, якую стварыў Версальскі дагавор. У прыватнасці, усталяваная ў Рызе ўсходняя мяжа Польшчы не адпавядала той лініі, якую краіны Антанты прынялі ў Парыжы. Пытанне аб межах было ключавым у адносінах паміж Савецкай Расіяй, Германіяй і Польшчай у новай сістэме міжнародных адносін і спараджала асноўныя супярэчнасці паміж імі. Гэтыя супярэчнасці вызначалі і геапалітычнае становішча Беларусі на ўсходняй перыферыі Версальскай сістэмы. Яго найбольш істотным элементам з'яўляўся падзел тэрыторыі Беларусі. Дасягненне беларусамі нацыянальнага адзінства, аб'яднанне беларускіх тэрыторый у межах адной дзяржавы магло быць ажыццёўлена пры ўмове трансфармацыі Версальскай сістэмы.

Задача ліквідацыі Версальскай сістэмы была цэнтральнай для савецкай знешняй палітыкі з моманту яе фарміравання. Прычым барацьбу з Версалем бальшавіцкае кіраўніцтва лічыла неаддзельным ад барацьбы з Польшчай як апорай Версалю ў ЦУЕ. У. Ленін адзначаў на IX Усерасійскай канферэнцыі РКП(б) 22 верасня 1920 г.: «Набліжэнне нашай арміі да Варшавы бясспрэчна даказала, што дзесьці блізка да яе

ляжыць цэнтр сусветнага імперыялізму, які пакоіцца на Версальскай дамове. Польшча… з'яўляецца настолькі магутным фактарам гэтай сістэмы, што, калі Чырвоная Армія паставіла гэты аплот пад пагрозу, захісталася ўся сістэма» [1, с. 282]. Сярод пастаноў Версальскага дагавора ўключэнне ў склад Польшчы шэрагу нямецкіх тэрыторый выклікала ў Германіі найбольшую незадаволенасць. У сілу названых абставінаў Германія таксама імкнуліся да ліквідацыі таго міжнароднага парадку, які быў усталяваны Версальскім дагаворам. Вынікам агульнага антыверсальскага курсу Расіі і Германіі стала падпісанне Рапальскага дагавора 16 красавіка 1922 г. Канцлер Й. Вірт казаў, што ў ліку галоўных матываў, па якіх Германія ішла на супрацоўніцтва з Расіяй, была тая роля, якую Францыя адводзіла Польшчы ў еўрапейскай палітыцы і лёс Верхняй Сілезіі [2, s. 10].

Для Масквы тэрыторыя Беларусі стала адным з участкаў барацьбы з Версальскай сістэмай. З прыняццем 15 сакавіка 1923 г. Саветам паслоў Антанты дадатковага пратакола да Версальскага дагавора, згодна з якім усходнія межы Польшчы атрымалі міжнароднае прызнанне, Рыжскі дагавор, які вызначыў падзел Беларусі, юрыдычна стаў часткай Версальскай сістэмы. Характэрная негатыўная рэакцыя савецкага ўрада на пратакол ад 15 сакавіка 1923 г. Наркам замежных спраў Г. Чычэрын заявіў, што савецкі бок не прызнае рашэнне краін Антанты і ў пытанні польскай усходняй мяжы будзе кіравацца выключна Рыжскай дамовай. Фактычна гэта быў пратэст савецкага ўрада супраць умацавання Версальскай сістэмы ў ЦУЕ [3, с. 242]. Палітыка СССР у той час была нацэлена на недапушчэнне трывалай інтэграцыі Заходняй Беларусі ў склад Польскай дзяржавы. Для дасягнення гэтай мэты савецкае кіраўніцтва выкарыстоўвала партызанскі рух, падтрымку антыпольскага руху ў Заходняй Беларусі, імкнулася дыскрэдытаваць Польшчу, выстаўляючы абвінавачванні ў парушэнні правоў нацыянальных меншасцяў.

Польская палітычная эліта ўсведамляла важнасць знаходжання Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў складзе Польскай дзяржавы. 7 красавіка 1923 г. Палітычны камітэт Савета Міністраў Польшчы ўхваліў палажэнне, якое абвяшчала, што ўладанне ўсходнімі ваяводствамі адыгрывае вельмі важную ролю ў справе набыцця Польшчай вялікадзяржаўнага статусу [4, s. 147]. Гэта прадвызначала неабходнасць для Польшчы трывалай інтэграцыі Заходняй Беларусі ў свой склад. Галоўным інструментам для дасягнення гэтай мэты ў Варшаве вызначылі нацыянальную асіміляцыю беларусаў. Адзін з лідараў нацыянальных дэмакратаў С. Грабскі ў гэтай сувязі пісаў, што беларускае і ўкраінскае пытанні ў Польшчы могуць быць вырашаны толькі шляхам утварэння на ўсіх землях дзяржавы польскай нацыянальнай большасці [5, s. 69–70].

Прыняты ў СССР курс на пабудову сацыялізму ў асобна ўзятай краіне абумовіў зацікаўленасць Масквы ў наладжванні эканамічнага супрацоўніцтва з Захадам. Польшча павінна была служыць «мостам» пры яго ажыццяўленні. Гэта абумовіла крокі савецкай дыпламатыі па паляпшэнні адносін з Польшчай. У прыватнасці, была спынена т. зв. «актыўная разведка» (дзейнасць па арганізацыі партызанскага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны) [6, с. 12–15]. Але гэта быў тактычны ход. Стратэгічная задача савецкай знешняй палітыкі па рэвізіі Версальскай сістэмы не змянілася. Часткай гэтай рэвізіі павінен быў стаць перагляд польска-савецкай мяжы. Падчас падрыхтоўкі Рэйнскага гарантыйнага пакта Масква дамагалася ад германскага партнёра па рапальскай палітыцы пацвярджэння, што ў будучай дамове польскія межы не атрымаюць ніякіх дадатковых міжнародных гарантый [7, s. 512, 513]. Лакарнскія пагадненні стварылі сістэму калектыўнай бяспекі ў Заходняй Еўропе, але не знізілі вастрыні супярэчнасцяў ва ўсходняй частцы кантынента. Савецкае кіраўніцтва зыходзіла з таго, што і пасля Лакарна можна працягваць будаваць сваю знешнюю палітыку на аснове выкарыстання супярэчнасцяў паміж пераможцамі і пераможанымі ў Першай сусветнай вайне. І. Сталін у снежні 1925 г. у сваім выступленні на XIV з'ездзе ВКП(б) казаў пра тое, што Лакарнская канферэнцыя абвастрыла супярэчнасці паміж пераможцамі і пераможанымі. Сярод несправядлівых тэрытарыяльных рашэнняў Версальскай дамовы ён указаў на «страту Беларуссю заходняй яе часткі» [8, с. 13–14]. Такім чынам, і ў рамках некалькі мадэрнізаванай у Лакарна Версальскай сістэмы тэрыторыя Беларусі заставалася месцам перасячэння інтарэсаў СССР і Польшчы.

У пачатку 1930-х гг. можна казаць пра тое, што значэнне беларускага пытання ў геапалітычнай сітуацыі ў ЦУЕ зменшылася. У савецкай палітыцы прасочваецца імкненне да паляпшэння адносін з Польшчай. Гэта было звязана, па-першае, з тым, што выбары ў сейм 1930 г. прадэманстравалі стабілізацыю «рэжыму санацыі». Па-другое, намеціўся крызіс рапальскай палітыкі. Гэта падштурхнула Маскву да таго, каб разыгрываць польскую «карту» як альтэрнатыўную германскай. Польшча рабіла крокі насустрач у рамках «палітыкі роўнааддаленасці» ад Масквы і Берліна Ю. Пілсудскага. Вынікам стала падпісанне савецка-польскага дагавора аб ненападзенні 25 ліпеня 1932 г. Ён пацвярджаў савецка-польскую мяжу і тым самым міжнародны статус Беларусі, зафіксаваны Рыжскім мірам, г. зн. яе падзел. Пры гэтым бакі фактычна дасягнулі маўклівай згоды зняць з парадку дня сваіх адносін пытанне аб нацыянальных меншасцях. Так, дэнансацыя Польшчай у 1934 г. Малога Версальскага дагавора аб правах нацыянальных меншасцяў не выклікала пратэсту з боку Масквы.

Абвяшчэнне савецкім кіраўніцтвам курсу на стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў снежні 1933 г. зусім не азначала адмовы ад змены існаваўшага міжнароднага парадку ў ЦУЕ. Падпісанне праектаванага Усходняга пакта рэзка павысіла б ролю Савецкага Саюза ў рэгіёне. Тым самым фармаваліся б перадумовы для рэалізацыі мэтаў савецкай знешняй палітыкі, у тым ліку і ў дачыненні да Заходняй Беларусі. Польскі ўрад са свайго боку вырашыў выкарыстаць змены ў савецкай палітыцы, каб зняць беларускую і ўкраінскую праблематыку з парадку дня польска-савецкіх адносін. Амбасада Польшчы ў Маскве запатрабавала ад кіраўніцтва СССР, каб савецкая прэса не ўздымала тэму польскай акупацыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Савецкі бок пагадзіўся не «раздзімаць» нацыянальныя праблемы ў абедзвюх краінах [9, с. 32–33].

Цэнтральным элементам знешняй палітыкі Польшчы ва ўмовах рэжыму «санацыі» стала імкненне да здабыцця вялікадзяржаўнага статусу. Важнейшым інструментам для вырашэння гэтай задачы з'яўлялася стварэнне блока дзяржаў «Міжмор'я». Пры рэалізацыі гэтага плана Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна павінны былі выконваць ролю «моста», які злучае краіны Балтыйскага і Чарнаморскага рэгіёнаў. Таму ўтрыманне дадзеных тэрыторый пад сваім кантролем мела для Польшчы надзвычай важнае значэнне. Пры гэтым польская палітычная эліта зыходзіла з таго, што для захавання кантролю над «усходнімі крэсамі» неабходна процідзейнічаць ўзмацненню міжнародных пазіцый СССР. У выніку яна выступіла ў ролі дзяржавы, якая перашкаджала падпісанню Усходняга пакта. Імкненне Польшчы захаваць у сваім складзе Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну стала адным з фактараў, які не дазволіў стварыць сістэму калектыўнай бяспекі ў сярэдзіне 1930-х гг.

Адным з матываў, якім кіравалася Варшава пры выпрацоўцы пазіцыі ў адносінах да палітыкі калектыўнай бяспекі, былі асцярогі адносна вынікаў вайны супраць Германіі кааліцыі з удзелам Савецкага Саюза. У матэрыялах польскага МЗС ад снежня 1936 г. гучыць думка, што вынікам такой вайны будзе камуністычная рэвалюцыя ў Германіі. Пагроза камунізму стане рэальнай і для Польшчы, бо аслабленыя вайной заходнія дзяржавы не змогуць аказаць ёй дапамогу [10, с. 204]. Гэтыя апасенні палякаў не былі беспадстаўнымі. Начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Чырвонай Арміі Л. Мехліс у сваім выступе на XVIII з'ездзе УКП(б) заявіў, што Чырвоная Армія ў выпадку ўзнікнення вайны з капіталістычнымі краінамі павінна «перанесці ваенныя дзеянні на тэрыторыю праціўніка, выканаць свае інтэрнацыянальныя абавязкі і памножыць колькасць савецкіх рэспублік» [11, с. 109].

У выніку Мюнхенскіх пагадненняў Версальская сістэма ўступіла ў перыяд свайго распаду. Прыняўшы ўдзел у падзеле Чэхаславакіі, польскі

ўрад унёс свой уклад у разбурэнне Версальскай сістэмы, захаванне якой аб'ектыўна адпавядала інтарэсам Польшчы. Мюнхенскія пагадненні прадэманстравалі, што дзяржавы Захаду гатовыя ахвяраваць інтарэсамі краін ЦУЕ, каб пазбегнуць вайны з Германіяй. Гэта рабіла міжнародны парадак, усталяваны ў рэгіёне пасля Першай сусветнай вайны, вельмі няўстойлівым. Але і ва ўмовах перадваеннага міжнароднага крызісу Польшча па-ранейшаму прытрымлівалася палітыкі недапушчэння актыўнага ўдзелу СССР у вырашэнні еўрапейскіх праблем, баючыся, што для яе гэта можа пацягнуць страту тэрыторый на ўсходзе [12, с. 118–119].

Савецкае кіраўніцтва ва ўмовах перадваеннага палітычнага крызісу 1939 г. прыйшло да высновы, што ў СССР ёсць шанец значна ўзмацніць свае міжнародныя пазіцыі ў ЦУЕ. Гэта разглядалася як важны фактар умацавання бяспекі СССР. Рэалізаваць свае планы ў ЦУЕ праз перамовы з Вялікабрытаніяй і Францыяй Масква не змагла [13, с. 27]. Краіны Захаду не гатовыя былі дзеля пагаднення з СССР ісці на перагляд міжнароднага парадку ў названым рэгіёне. У той жа час у Берліне ўлічвалі зацікаўленасць СССР у вяртанні ў свой склад тэрыторый, саступленых Польшчы па Рыжскаму дагавору [14, с. 190]. Менавіта на гэтай аснове ішлі пошукі пагаднення паміж СССР і Германіяй летам 1939 г. 12 жніўня часовы павераны ў Берліне Г. Астахаў пісаў В. Молатаву: «Адмова ад Прыбалтыкі, Бесарабіі, Усходняй Польшчы (не кажучы ўжо пра Украіну) — гэта ў дадзены момант мінімум, на які немцы пайшлі б без доўгіх размоў, абы атрымаць ад нас абяцанне неўмяшання ў канфлікт з Польшчай» [15, с. 185]. Падпісанне савецка-германскага дагавора аб ненападзенні разам з сакрэтнымі пратаколамі стварыла для СССР спрыяльныя ўмовы для рэвізіі міжнароднага парадку ў ЦУЕ ў адпаведнасці са сваімі дзяржаўнымі інтарэсамі. Крах гэтага парадку, канчатковы распад Версальскай сістэмы стварылі ўмовы для карэннага змянення геапалітычнага становішча тэрыторыі Беларусі — уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР.

Як бачна, для Версальскай сістэмы міжнародных адносін была характэрна высокая ступнь неўстойлівасці. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што яе стваральнікі, дзяржавы — пераможцы ў Першай сусветнай вайне, пры фарміраванні новага міжнароднага парадку праігнаравалі інтарэсы многіх краін і народаў (у тым ліку і аказаўшыхся падзеленымі беларусаў) і падштурхнулі іх да імкнення падвергуць рэвізіі Версальскую сістэму. Яе недасканаласць стала адной з перадумоў узнікнення Другой сусветнай вайны.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Ленин В. И.* Полн. собр. соч.: в 55 т. М.: Издат. полит. литерат., 1981. Т. 41.

2. *Grosfeld L.* Polska a stosunki niemiecko-sowieckie. 1918–1939: monografia. Warszawa: Niezależna Oflcyna Wydawnicza, 1988. 43 s.

3. Документы внешней политики СССР: в 24 т. М: Госполитиздат, 1962. Т. 6.

4. O niepodległą i granice. [T. 5]: Protokoły Komitetu Politycznego Rady Ministrów, 1921–1926 / wstęp, wybór, oprac. i przygotowanie do druku M. Jabłonowskiego, W. Janowskiego. Warszawa: Akademia Humanist. im. A. Gieysztora, 2004.

5. *Grabski S.* Uwagi o bieżącej historycznej chwili Polski. Warszawa: Nakładem księgarni Perzyński, Niklewicz i s-ka; 1922. 160 s.

6. Материалы «Особой папки» Политбюро ЦК РКП(б)–ВКП(б) по вопросу советско-польских отношений. 1923–1944 гг. М.: [Б. и.], 1997.

7. *Stresemann G.* Vermachtnis: in 3 b. Berlin: Ullstein Von Henri Bernhard, 1932. B. 2.

8. XIV съезд Всесоюзной коммунистической партии (б): стеногр. отчет. М.; Л.: Госполитиздат, 1926.

9. *Лазько Р. Р.* Заходнебеларускае пытанне ў польска-савецкіх адносінах у пачатку 30-х гг. // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі; 17–18 верасня 1999 г.; Мінск, Беларусь. Мінск: БДУ, 2000.

10. *Лазько Р. Р.* Перад патопам. Еўрапейская палітыка Польшчы (1932–1939). Мінск: БДУ, 2000.

11. *Загладин Н. В.* История успехов и неудач советской дипломатии. Москва: Международные отношения, 1990.

12. Год кризиса. 1938–1939: Док. и материалы в 2 т. Т. 1. 29 сентября 1938 г.–31 мая 1939 г. / М-во иностр. дел СССР. М.: Политиздат, 1990.

13. *Чубарьян А. О.* Канун трагедии: Сталин и международный кризис: сентябрь 1939 – июнь 1941 года. М.: Наука, 2008.

14. Белые пятна — черные пятна: сложные вопросы в российско-польских отношениях. Москва: Аспект Пресс, 2010.

15. Год кризиса. 1938–1939: Документы и материалы в 2 т. Т. 2. 2 июня 1939 г.–4 сентября 1939 г. / М-во иностр. дел СССР. М.: Политиздат, 1990.